БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш. пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 73. Менск. Субота 22 чэрвеня 1918 г. Год I

„Нізалежная Беларусь“

У адным з нумэроу «Дзенніка Кіевскаго» знайходзіцца артыкул п. L. R. перадрукаваны цалком у «Dz. Polski»

Падаушы у пачатку артыкулу ведамасьць аб радзе і проклямаванні ею нізалежнасьці Беларусі і зьмест I устаунай граматы п. L. R. так ацэнівае сітуацыю:

Перад усім, бяручы справу у грунту, Беларусь мае шмат меней (за Украіну. Рэд.) даных для паиствовай самаістнасьці з боку гісторычнаго экономічнаго і грамадзкаго культурнаго. Затым, праклямаванне нізалежнасьці Беларусі наступіло як бы крыху... ранавато і істнаванне беларускаго панства для сіл важачых цяпер у міжнароднай палітыцэ ні яуляецца канечнасьцю, але надта жаданым фактам.

Беларусь парвала свае дзяржауныя зьвязкі з Расіяй ужо пасьля заключэння берасьцейскаго міру, устанауліваючаго заходнія граніцы Расійскай рэспублікі саветау, у склад якой Беларусь дагэтуль уходзіла.

Берасьцейскай умовай, каторай тэррыторыя, на якую беларускае прэдстауніцтво мае угрунтаваныя і, ніугрунтаваныя прэтэнсіі падзелено на часьці. За рубяжом астауся Мазырскі павет і паветы Гродзеншчыны, каторыя беларусы хочуць уважаць за свае, уключаючы нават Гродно і Беласток з этнографічно-польскім округам.

Да гэтаго дня ні ведамы льосы Прыпяці на усход ад Выганоуского возера і хто ведае ці ні спаткае гэтую зямлю льос Мазырскаго павету у скутак чаго Беларусь згубіла-бы около мільена этногрмфічно-беларускай людносьці і артэрыі воднай камунікацыі маючыя агромністае гаспадарчае значэнне.

Апрача гэтаго астаюцца рэшчэ споры з літвінамі, каторыя свае прэтэнсыі расьцягаюць за Берасьцейскі Кордон в ніурэгуліраваныя стасункі з Расіяй—да сягоднашняго дня упрауляцай саветамі. I нарэшці справа стасункау да Польшчы.

Абрысаваушы далей унутранае становішчо Беларусі пан L. R. кажа далей:

Здаецца аднак, што сярод тварцоу беларускай дзяржаунай ідэі есьць людзі разумеючыя сітуацыю Беларусі. Людзі гэтыя стараюцца знайсьці дарогі да злучэння усіх беларускіх земляу і хочуць паразумецца з Літвінамі.

Прагнуць яны «урэгуліраванне беларуска-літоускіх дзержауна-нацыянальных стасункау на аснове супольнаго будоуніцтва і так сама паразумення с Курляндзіяй у справе доступу да мора?

Плян гэты есьць у істоце плянам уваскрашэння гістарычнай Літвы, беларуска-літоускай дзержавы.

I трэба прызнаць што гэтая канцэпцыя магла бы аказацца жыццевой. Землі Вялікаго Літоускаго Княжства зьвязаныя с сабой географічнымі і экономічнымі варунками маюць традыцыю многавекавога супольнаго істнавання...

Але—дадае п. L. R., спраудженне гэтай концэнцыі нізалежыць толькі ад Беларусау і волі Літвы, але ад сілы мацнейшай дыктуючай варункі і Літве і Беларусі і можна сумлевацца чы гэтай сіле было выгадным уваскрашэнне у тэй ці іншай форме гістарычнай Літвы.

Нас артыкул п. L. R. цікавіць як первая проба закордонцай польскай прэссы зрабіць больш об'ектыуную ацэнку сітуацыі на Беларусі. Большая об'ектыунасьць і большая спакойнасьць з якой аутар піша аб гэтым у газэці якая выходзіць на «kresach», дае нам пэунасьці што і у сябе мы спаткаемся прынамсі са спакойным, калі ні прыязным, стасункам да Беларускай панствовасьці з боку той часьці нашых культурных сілау, якая лічыць сябе духоуна належачай да Польшчы.

Ні уступаючы у спрэчку па поваду нікаторых падробнасьцяу у артыкуле п. L. R. зазначым толькі што сярод «тварцоу беларускай ідэі панствовай» пануе роунае зауфанне у добрае развязанне нашых «заходніх» стасункау і у асобнасьці да тае сілы у якой сумлеваецца п. L. R. Але уконстутыунаванне гэтых стасункау рэч такая, якая ні глядзеб на яе канечнасьць, можа быць зроблена паволі і ні надта сьпешаючыся. Першым і найважнейшым заданнем даннаго часу есьць для нас аканчацельнае устанауленне нашых дзержауных стасункау з Усходам, толькі зрабіушы гэта мы здолеям аддаць больш усілкау і больш увагі нашым заходнім справам.

П.

Агульныя весткі.

САН-ФРАНЦІСКО. Стварылося новае таварыство с капіталам у 200 мільёнаў доляраў, якое мае будаваць караблі с пэмзы і лавы. Працэс гэты грунтуецца па адкрыцці вядомай хімічнай рэчы, якая робіць мажлівым прыгатовіць вульканічны попел і з яго рабіць лёгкі цэмэнт.

БЭРЛІН, 19/VI. Згодна загаду міністэрства народнай асьветы, цяпер, пасьля таго як утвораны мір з Расіяй, дзеці расійскаго падданства вноў могуць ладзіць грамадзкія школы.

ХРЫСТЫЯНІЯ 18/VI. Як паведамляе нарвэжскае генэральнае консульство, чужаземным капітанам і матросам нэйтральных караблёў, якія напраўляюцца або прыбываюць з гэтых дзяржаў, забаронено высажывацца у гавані Ньюкестль. Гэто нічога іншае, як зачыненне гавані для усіх нэйтральных караблёў.

Ангельскія страты. Па афіцыяльных ангельскіх сьпісках страт за час ад 2—15 чэрвеня, лічыцца 115,768 імён, паміж іх 5330 афіцэраў.

ЛУГАНО, 18/VI. Па пэўных прыватных вестках, у канцы апошняго тыдня у Мілані і Турыне адбыліся вялікія, пакірованыя проціў ураду, дэмонстрацыі. Італьянская цэнзура спыняе расшырэнне падробнасьцяў.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 18/VI. На гмаху сэнату у нядзелю урочыста быў падняты новы фінляндскі дзяржаўны штандар. На пазычку волі у агульным ліку было падпісано 127 мільёнаў фінляндскіх марак.

БАЗЭЛЬ, 18/VI. Згодна нідаўна атрыманым весткам, ангельцы ўсё болей забіраюць у свае рукі паліцэйскія функцыі у французкіх местах, дзе яны маюць уласны штат паліцыі. Глаўнае блага настроено проціў іх насяленне Парыжа. Там ангельскія паліцэйскія сілай забараняюць выежджаць сямействам на поўдзень, якія апасаюцца нямецкіх налётаў.

ЖЭНЭВА, 18/VI. Пад націскам узбуджанаго настрою сярод социялістычных партый і рабочаго клясу, Клемансо, па жаданню прэзыдэнта Пуанкарэ, прапанаваў социялістычным кіраўнікам ўступіць у яго габінэт. Аднак жа социялісты аднагалосна заявілі, што яны пры цяперашнім становішчы ні могуць браць на сябе ніякой адпаведальнасьці.

БАЗЭЛЬ, 18/VI. Каб успакоіць населенне Парыжа, ангельскі урад паслаў туды у одпуск афіцэраў. Па славах газэты «Бэрлінэр Тагэблат», ен дайшоў гэтым як раз праціўнасьці назначанай мэты. На бульварах ангельскіх афіцэраў зачэплівалі і рабілі іх адпаведальнымі за цяжкія страты. Гэто нарэшці дайшло да такіх размераў, што прышлося прыастанавіць адпускі у Парыж.

ЖЭНЭВА, 18/VI. Глаўнакамандуючым над усходняй арміяй на мейсцо генэрала Гюіома назначэны генэрал Франш Эспэрэй.

ЛЕНДАН, 18/VI. Згодна газэты «Таймс», Японскія банкі прапанавалі Кітаю пазыку у 50 да 100 мільёнаў іен, гарантаруемы табачнай манаполіяй.

Весткі з Расіі.

З Масквы.

Прыехаўшая з Масквы на гэтых днех асоба добра поінформованая аб настроі у вышэйшых маскоускіх сфэрах перадаець нам гэтакае:

—«Масква цяпер горад голаду. Нават за вялікія грошы ні можна у ей быць сытым. Цэны трымаюцца шаленыя. Фунт мяса, як і фунт хлеба, каштуе 10 рб., фунт сала 20—22 рб., пуд жытняй мукі 250 і болей рб. Людзі, каторыя дауней лічыліся багатырамі, жывуць цяпер на палавіну галадаючы. Але гэтыя цянасьці нічога ні значаць у парауненні с пануючым тамака тэррорам. Ніхто ні можа быць пэуным, што выйшоушы з дому ен вернецца назад. І седзючы на кватэры ні заусёды можна пачуваць сябе бязпэчным. Могуць уварвацца зрабіць рэвізію, забіць. Найгорш і найбольш церпяць людзі, маючыя цяпер нішчасьце належаць да «буржуазіі» т. е. уся інтэлігэнцыя. Яны усе іщчэ знайходзяцца пад падазрэннем хоць, па праудзі, нічога ні могуць зрабіць і саусім паапушчалі рукі. Паміж тым развал дзержавы штодня узмацоуваецца. Знауцы Маскоускаго жыцця і гаспадарчаго стану усей Расіі кажуць, што у нескольки бліжэйшых месяцау стан павінен шмат пагоршыцца.

I вось пасярод лаупейшых кіраунікоу палітычнай мысьлі і прамысловасьці у Расіі паволі нарастае сымпатыя да Нямеччыны. Магу сказаць, што у Маскве я спаткау найзаузятшых германофілау.

Поруч з пашырэннем германофільства расьцець само праз сябе глухое нідавольство цяперашней сытуацыяй. Але гэта ні аслабляе большэвікоу. На мае зданне яны трымаюцца цяпер мацней чым калі нібудзь. Прауда, німа нігдзе і ні у чым парадку, паусюдах пануе сваявольство, аднак у гэтай слабасьці, пакуль што і сіла большэвікоу. Паволі яны думаюць надаць усе-ж такі жыццю пэуныя нормы. Для гэтаго у іх

покуль што ні толькі у руках сілы для прымусу, без якой, яны ужо зразумелі гэта, ні абыйсьціся. «Чырвоная армія» аказалася збродам гультаеу, да таго распушчаных, каторы ні мае і ні хоча мець ніякай дысцыпліны. Цяпер болшэвіцкі урад думае замяніць яе праудзівай арміяй, па характару напамінаючай да-рэвалюцыйную армію, для чаго маюць быць зарэкрутованы ні выкарыстаныя прызывы апошніх гадоу. А гэты зброд, кажуць большэвікі аб чырвонай арміі,—трэба распусьціць».

Німа ведама толькі, ці гэто, т. е. набор новай і роспуск старай арміі, ім удасцца».

С Петраграду.

З лісту атрыманаго с Петраграду мы даведваемся, што тамака фунт хлеба каштуе 10 р. фунт мяса 10-12 р., дзесятак яец 13 рб., фунт цукру 25 рб. і г. д. Аутор лісту які атрымоувае 700 рб. месячнай пэнсіі німаль што ніколі ні бывае сытым. Жыцце пад фэрулай большэвікоу, у гэтакіх варунках ідзець «спакойна».

Место і веска.

С самых даўніх часоу у расійскай імпэрыі былі два пункты, каторыя пастаянна цягнуліся адзін да аднаго, ні можучы абыйсьціся без ўзаемнай помачы, і у той жа самы час былі усё-ж такі настроены праціўна. Гэтыя два пункты—место і вёска.

Праціўны настрой аднаго проціў другого, састаяў у канкурэнцыі жыцця, кожны пункт пpackазываў старану свайго лепшаго добрабыту с погляду эканамічнаго і с погляду псхічнаго. Нідастаючаго у аднаго дапаўняў другі і гэто самае з другога боку іх пастаянна і зьвязывало.

За усе пэрыады асвабадзіцельнаго руху у Расіі за 19-ае сталецце і новьпей істнавалі дзьве элемэнтарныя сілы — фундамэнтны цэмэнт, па якім трымалося кіраўніцтво дэмократыі. Гэтыя элемэнтарныя сілы—хлеваробы-селяне і фабрычныя рабочыя па местох.

Зьвязаныя паміж сабою агульнай ідэяй асвабаджэння ў барацьбе с эксплоатыруючай іх самодзержаўнай машынай у Расіі, яны усё-ж ніколі ні былі злучаны цесна—у адно.

За пэрыод 1917 году у часе пэраваротy у Расіі гэтыя два лагэры выформаваліся у два значныя абліччы—«Совѣтъ рабочихъ депутатовъ» і «совѣтъ крестьянскихъ депутатовъ». Спачатку между гэтымі двума «саветамі» усе шло гладко і добра, калі пад агульным большэвіцкім бэрлом масы і аднаго і другога клясу грабавалі—адны «буржуяў» местовых, другія—землеўласьнікаў па маёнтках. Гэтакім спосабам «асвабадзіцельная праца» шла пакуль людзі ні утаміліся і ужо на гэтай часьці работа удачна закончылася. І вось тыя добрадзеі, падсекаючы той самы сук, на якім яны сядзелі, упалі з дзерава у ніз—здань гаспадарскай разрухі па ўсіх землях быўшай імпэрыі вырасла у жудасную здань голаду. Гэты голад прыняў цяпер вялікшыя размеры на руінах Расіі. Па гарадах—соткі тысяч галадаючых людзей ў літэральным значэнні гэтаго слова.

І вось цяпер-то там вельмі яўна выступіло проціў вёскі место. Там організованы цэлыя атрады чырвонагвардзейцаў і г. д., якія адкамандзіраваны ўзброяным чынам зьбіраць харчы па вёсках. Пакуль што гэта мілая работа выдатных рэзультатаў ішчэ ні дала ніякіх. Але нам важны самы факт гэтых «рыцараў волі», да якіх паганых дзеяў льос іх пакіраваў і да чаго там абострапы адносіны паміж местам і вёскай.

Калі мы, побач з гэтым, зробім сапастаўленне адносін места з вёскай на Беларусі, то па гэтай часьці дайдзем да досіць прыятных рэзультатаў. Стараючыся за час пераваротy злучыць место з вёскай у адно цэлае—у нацыянальна асьвядомлены беларускі народ, каторы перамагае уселякія партыйныя межы, і разам з гэтым, уцёкі ад гэтуль большэвіцкіх рыцараў, зрабілі тое, што вёска з местам у нас на Беларусі завяовалі сабе становішчо, як раз праціўнае большэвіцкаму. Колькі мага з вёскі дастаўляюцца прадукты у место. Паля абсеяны і усё ідзець чын—чынам паводлуг цяперашніх, наагул, часаў.

Выпукласьць кантрастаў між тутэйшымі гаспадарскімі парадкамі і гаспадаркамі у цапстве большэвізіі красnамоўна сьведчуць прыезджаючыя з Масквы: Як раз на граніцы у Оршы гэто добра відаць —на старане акупацыйнай зямлі паля апрацованы самым ідэяльным спосабам, а па той старане «волі»—адны пустары.

У гэтым кірунку мы спадзеваемся, што у нас на далей ішчэ болей цесна злучацца место з вёскай, як зусім выкарэніцца у нашым краю руйнуючы дух большэвізма, каторы пільна сеяўся тут у свой час маскоўскай большэвіцкай ардой, як пойдуць школы на усяму краю, як пойдзе у верх эконамічная культура, а глаўнае, як беларуская асьведаміцельная ідэя запануе сярод самых шырокіх народных массаў.

З. Б.

На рэках Вавілону.

(успамінкі уцекача)

«Клікала я прыяцеляу маіх,— Яны ашукалі мяне».

(Плач Ерэміі, I, 19).

I.

Асабліва страшным і на доўга у патомках памятным будзе на Беларусі канец лета у 1915 годзе. Тагды уцекаўшая с—пад нямецкаго націску расійская армія начала сьпешную, на доўга слаўную, эвакуацыю цывільнаго насялення. Падзеі гэта саўсім нідаўняго часу і аб іх пэўна усе ішчэ помняць. Помняць так сама і аб тых страхах аб нямецкім войску, якія сеяліся прэдстаўнікамі расійскай улады сярод насялення і змушалі яго кідаць родныя вуглы і уцякаць у «брацкую» Расію з верай у помач у добрае сэрцо яе жыхароў. Усе тутака, у гэтых мейсцох помняць тую жывую, зруйнаваную Беларусь, якая сярод раскладаных на вуліцах гарадоў і у чыстым полі, асенняй слаты, нізлічаных штодзенных матэрыяльных страт, плачу малых і стогнаў старых, устрамлялася на усход. Чалавеччае горо зьлітай уцекачоўскай массай запанавало на усіх дарогах. Чым далей у Вялікаросію, тым радзейшай рабілася масса, тым болей сьцежак займалі уцекачы, і паволі гусьцело насяленне канцовых пунктаў гэтаго паходу—гарадоў цэнтру, ўсходу і далёкіх ўсходніх акраін ні аб'ятнай імпэрыі. У адным с такіх пунктаў—Казані, давялося і мне пражыць тры годы. Вот аб тым што я бачыў там, ні аб усім, жыцці а толькі аб аднэй з яго старон я і хачу гэта разсказаць.

II.

М. Казань, у каторым я разам з другімі уцекачамі апыніўся у канцы жніўня 1915 году,—даўнейшая сталіца Казанскаго царства—стаіць на левым беразі р. Казанкі, вярсты за 2—3 ад таго мейсца дзе яна дападае да Волгі. Адзін з найстарэйшых Расійскіх унівэрсытэтаў і некалькі іншых выжэйшых школаў, як мушчынскіх, так і жаноцкіх, пяць мушчынскіх і больш як столькі жаноцкіх гімназыяў, дзьве рэяльныя і адна гандлёвая школа, тры тэхнічных, адна агранамічная і шмат ніжэйшых школаў а так сама школа для прыватных місіянэраў для Сыбіры і Далёкаго Усходу і Праваслаўная Духоўная Акадэмія, робяць Казань праўдзівым цэнтрам асьветы для агромнай тэррыторыі. У горадзе і вакол яго раскідано шмат хвабрык і с паміж іх ёсьць знаныя ва усім прамысловым сьвеце, як напр., хвабрыка мыла, сьвечак, гліцарыны і інш. братоў Крэстовніковых.

Старыя жыхары хваляць свой горад, але нам, уцекачом ён паказауся інакшым. Место с такой лічбай прасьветных установ, мінаючы ужо жыхароў, якія здаваліся нам дзікаватымі, ні мае выгляду і парадкаў нават нашых далёкіх ад Эўропэйскаго устройства мест.

У горадзе можна заблудзіцца, па прычыне браку нумэрацыі дамоў, ніймення па рагох вуліц дошчачак з іх назвамі. Па гэтых без'імённых вуліцах спакойна ходзяць сьвінні і іншая жывёла...

III.

Дзе-б яно ні было, але прытулак, свой кут,—найважнейшае для чалавека. Але з гэтым нам тут прыйшлося цяжка. Першыя хвалі уцекачоў у Казані адразу пазаймалі усе вольныя умешканні. А за імі прыбывалі ішчэ і ішчэ. Цэны на кватэры шалёна палезьлі у гару. Цэны на хлеб і усякую еду так сама. Найчасьцей без усякаго мення, якое ішчэ можна было-б прадаць, без капейкі грошы у кішэні, людзі па ныя праве памiралі з голаду па колькі дзён і каля яго, —пад адкрытым небам, на холадзе.

С пачаткам гэтай «іммiграцыі» у Казані пачалі адкрывацца камітэты дапамогі уцекачом. Такім чынам поўсталі расійскі, польскі, латышскі, літоўскі і інш. камітэты, але —нішчасьце! ні было каму адчыніць беларускаго камітэту. Па ўсёй дарозе і тутака людзі розных нацыяў спатыкалі матэр'яльную падмогу і духоўнае падтрыманне ад сваіх братоў, адны беларусы ні дзе ні спатыкалі гэтаго. Ратуючыся ад загібелі ішлі нашыя людзі пісацца у расійскія і польскія камітэты, дзе іх прыймалі ахвотна і, трэба аддаць справядлівасьць, памагалі на роўні з сваімі, але даючы хлеб, забіралі ад іх беларускую душу.

Грыневіч.

Афіцыяльнае навядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 20 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Амаль па усім фронце дзеяльнасьць ворага усілілася вечары. Артылерыйскі агонь ажывіўся. Сільныя пяхотныя атрады павялі ва многіх мейсцах наступленне на нашы пазыцыі. Яно было адбіто.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Узабнаўлёныя варожыя спробы прабіцца праз Клінкоскі вучастак паўночна-захадпяй Шато—Тьерры напрацкавы ніудачы ад нашаго агня. На другім фронці баевая дзеяльнасьць аставалася у умераных межах.

Группа Арміяу Гальвіца.

Паўднёва—захадвяй Орн былі адбіты ночныя варожыя атакі. Між Маас і Мозэль некаторыя штурмовыя атрады урваліся у амэрыканскія акопы у Сэшырэй і нанясьлі ворагу цяжкія страты.

Капітан Бэрдтольд атрымаў сваю 36 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар фон-Людэндорф.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Зьменьшэнне штатау у меськай управе ужо дайшло да кватэрнаго аддзелу, дзе замест 15-ці служачых астаулено толькі—6.

Беларускі хор, пад упраулением Церауского, будзе пе на архіерэйскім богаслужэн у мужскім манастыре у пан дзелак, 11 чэрвеня.

С прычыя праваслаўнаг сьвята сьв. Тройцы заутра, і панядзелак, 11 чэрвеня (с ст.) служачыя меськай упр вы і казенных установау ась баджаюцца ад заняцця.

Шэсьцітыдзельныя курсы д народных вучыцелеу у Бабру ску адчыняюцца 1 ліпня дзе дапаукення агульнай спэцы яльнай пэдагогічнай адукац дзеячоу народнай школы.

Кнігарня губ. земства пра пануе злажэнне бібліатэк ва ласных. агульных і прышколь ных, якія выдаюць па трэба ванням павятовых і валасны упрау, вучыцельскіх гуртко і хаурусау, коопэратывау прасьветных таварыств за на лічны рахунак.

По асобай згодзе мажлі одпуск на камісію кніг д 200,000 штук. За 200 руб. мо жна мець бібліатэку.

Цэна на хлеб на вольнай прадажы:

У Горадні—37 к. фун.
каля Вільні—60 к. «
у Менску—2 р. — «

Апошнія дажджы вельм ажывілі віды на ураджай агуркоу, вішэнь, капусты грыбоу.

Такія одклікі тутэйшых спэ цыялістау па агароднай справе

У дэмократычнай сталоуцы пры ст. Менск Л.-Р. ж. д. за апошні час абеды ці з мясам ці без яго лічуцца усе роуна— па $1^{1}/_{2}$ рубля без хлеба.

Губ. зем. управа складывае павядомасьці аб сваіх ніадкладных стацціях выдаткау, патрэбных дзеля дастаулення камісару большэвізма Ландэру на зварот захопленых большэвікамі пры уцеках з Менску земскіх сумм, па якому, езьдзіу у Маскву і Пецярбург бухгалтэр земства.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтво «Т-во Заранка.»

Друкарня Я. А. Грынблята.